



Усяслаў Чарадзей. Фрагмент мініяцюры Радзівілаўскага летапісу



Брама Менскага дзядзінца і ўмацаванні вала XI стагоддзя. Рэканструкцыя Ю. Зайца паводле археалагічных раскопак 1984 года. Гэты замак быў пабудаваны на сутоках Свіслачы і Нямігі пасля зруйнавання горада Менска на рацэ Менцы. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што першапачаткова гэты замак называўся Няміга



Ахвярны камень з паганскага капішча на беразе возера Павульскае паблізу Полацка. Як выявілі навуковыя даследаванні, на Полаччыне існавала сістэма паганскіх бажніцаў. Яны канцэнтраваліся на поўнач ад Полацка ў сістэме азёр Янова—Павульскае—Цётча. Акрамя рэштkaў каменных капішчаў тут захаваліся дахрысціянскія тапанімічныя назвы: возера Янова, рака Дзіва, гара Дзівіна, або Таўкачы, і інш.



**Захоп братамі Яраславічамі Менска на рацэ Менцы і вывядзенне з горада палонных гараджан. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу**



Бітва на Нямізе 3 сакавіка 1067 года паміж дружынай Усяслава Полацкага і аб'яднанымі сіламі кіеўскіх князёў. Нягледзячы на перавагу ў колькасці войск Яраславічаў, Усяслаў не быў пераможаны. Ён адступіў, а знясіленыя кіяўляне не сталі яго даганяць



Залаты скарб X стагоддзя з 5 бранзалетаў і кавалка шыйнай грыўні, знойдзены ў 1984 годзе выпадкова на тэрыторыі полацкага стадыёна «Спартак»



Дзвесце срэбраных манет-дырхемаў Арабскага халіфата са скарба, адкапанага каля вёскі Казьянкі пад Полацкам. Там было знойдзена каля 8 тысяч такіх манет, датаваных першай паловай X стагоддзя. На думку даследчыкаў, агульная вага скарба, які, на жаль, цалкам не захаваўся, складала каля 20 кілаграмаў



Сафійскі сабор у Ноўгарадзе. Збудаваны ў 1045—1050 гадах. Ён быў непасрэдным папярэднікам Сафійскага сабора ў Полацку. У 1066 годзе Усяслаў Чарадзей, калі захапіў Ноўгарад і спаліў яго да Нераўскага канца, паздымаў з гэтага сабора панікадзілы і званы. Праз два гады, калі давялося князю быць вязнем кіеўскай турмы, як абуджанае сумленне, гучалі ў яго душы тыя званы з полацкай Сафіі



Полацкі Сафійскі сабор. Збудаваны ў 1050—1055 гадах. Рэканструкцыя першапачатковага выгляду паводле Г. Штыхава. Паўднёвы бок. У свеце былі ўсяго чатыры Сафійскія саборы, менавіта яны лічыліся ва ўсходніх славян сімвалам дзяржаўнай незалежнасці



Надпісы-графіці на камені, які быў умураваны ў сцяну полацкай Сафіі. Спецыялісты па старажытных надпісах пераканаўча даказалі, што імёны муляраў — Давыд, Таўма, Мікула, Капес і іншыя зробленыя ўпэўненай рукою чалавека, які не толькі ведаў грамату, але і часта ёю карыстаўся. Дарэчы, камень у старажытнай муроўцы ляжаў так, што зрабіць надпісы пасля таго, як Сафію збудавалі, было немагчыма



Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу, якая, на думку аўтара, адлюстроўвае асвячэнне Сафійскага сабора ў Полацку ў прысутнасці Усяслава Чарадзея. Тэкст на гэтай старонцы летапісу не адпавядае ізаграфічнай выяве



Полацкі Сафійскі сабор, пачаткова закладзены яшчэ ў эпоху Усяслава Чарадзея. Сучасны выгляд з паўночна-заходняга боку. Сёння, пасля некалькіх перабудоў, бажніца ўяўляе выдатны помнік беларускага барока XVIII стагоддзя



Усяслаў Чарадзей з сынамі перапраўляецца цераз Дняпро на перамовы з Яраславічамі. Справа — поруб у Кіеве, дзе, парушыўшы крыжацалаванне, палачанаў зняволілі



Паўстанне 15 верасня 1068 года ў Кіеве супроць князя Ізяслава Яраславіча, дружына якога была разбітая полаўцамі, а ён адмовіўся выдаць кіяўлянам коней і зброю. Гараджане падзяліліся на дзве часткі, адна з іх пайшла на князёў двор, а другая — вызваляць Усяслава

Мініяцюры Радзівілаўскага летапісу



Усяслава вызваляюць з порубу, дзе ён знаходзіўся з сынамі сем месяцаў



Усяслаў Чарадзей на кіеўскім пасадзе. Летапісцы маўчаць пра ягоную дзейнасць на гэтым пасадзе, але даследчыкі мяркуюць, што ў гэтым часе ён адбіў напад полаўцаў на паўднёвыя землі Русі і нават даходзіў да Тмутараканя

Мініяцюры Радзівілаўскага летапісу



Залатая брама горада Яраслава ў Кіеве X—XIII стагоддзяў. Такой яе бачыў Усяслаў Чарадзей, калі быў кіеўскім князем. Сучасная рэканструкцыя



Сафійскі сабор у Кіеве ў XI стагоддзі. Макет-рэканструкцыя. Аўтары Ю. Асееў, С. Волкаў, М. Крэсальны. Тут у 1068 годзе ў алтарнай частцы, на «троне», адбылося «ўхваленне» Усяслава кіеўскім князем



Сын князя кіеўскага Святаполк на полацкім княжанні. Уцёкі Усяслава з-пад Белгарада, а пасля і з Полацка. Пасля таго як Усяслаў добраахвотна пакінуў кіеўскі пасад, ён не змог доўга ўтрымацца і ў сваім родным горадзе. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



Мерцвякі-«наўе» б'юць палачанаў. Вучоныя мяркуюць, што ў такой форме ў летапісе адлюстравана пошасць (эпідэмія). Пачатак пошасці пад Друцкам



Наўе на вуліцах тагачаснага Полацка
Мініяцюры Радзівілаўскага летапісу



Пярсцёнак Усяслава Чарадзея. Абставіны, пры якіх быў знойдзены гэты пярсцёнак з надпісам К<НЯ>З<Ь> ВС<ЕС>Л<А>В П<0>Л<0>Ч<С>К<И>, да гэтага часу дакладна не высветленыя. Некаторы час ён захоўваўся разам з пярсцёнкамі-пячаткамі Барыса Усяславіча і Рагвалода Барысавіча ў Беларускім музеі імя Івана Луцкевіча ў Вільні. Сёння — у фондах Дзяржаўнага музея Беларусі (Мінск)



Карта Полацкага княства — першай беларускай дзяржавы — у часы Усяслава Чарадзея. Паводле Л. Аляксеева, Г. Штыхава і Г. Семенчука.

Тэрыторыя гаспадарства абыймала не толькі этнічныя беларускія землі, але і землі, населеныя вугра-фінскімі і балцкімі плямёнамі. Разам з умацаваннем агульнай бяспекі ад знешніх ворагаў гэта дазваляла кантраляваць важныя гандлёвыя шляхі — па Дзвіне ў Балтыйскае і па Дняпры ў Чорнае мора